***Т. А. Пешка***
*Навуковы кіраўнік — В. М. Шавель*
Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт,
г. Баранавічы, Рэспубліка Беларусь

# ВЫКАРЫСТАННЕ ПРЫЁМАЎ ІНАВАЦЫЙНЫХ ТЭХНАЛОГІЙ У ПРАЦЭСЕ СТВАРЭННЯ ЎЛАСНЫХ ТЭКСТАЎ

Тэкст з’яўляецца адной з галоўных крыніц, адкуль вучні атрымліваюць веды, дыдактычны матэрыял, на аснове якога настаўнік пры выкладанні ўсіх раздзелаў і тэм школьнага курса роднай мовы выпрацоўвае ў сваіх выхаванцаў лінгвістычныя веды, аналітыка-сінтэтычныя моўныя і практычныя маўленчыя ўменні і навыкі, гэта узор і стымул для стварэння самастойнага выказвання.

Вынікі праведзенага сярод настаўнікаў анкетавання паказалі, што пры выкладанні беларускай мовы ў агульнаадукацыйнай школе вучням для аналізу прапануюцца тэксты розных тыпаў і вельмі рэдка аналізуюцца тэксты розных жанраў. Пра гэта сведчаць вынікі праведзенага анкетавання настаўнікаў. Вучні вельмі любяць казку, і таму ў сярэдніх класах настаўнік можа выкарыстаць урокі, разлічаныя праграмай на развіццё мовы, для аналізу казкі і падрыхтоўкі школьнікаў да яе самастойнага складання.

Добрай казцы, лічыў С. Я. Маршак, уласцівыя «вялікі ахоп падзей у хуткім, нават імклівым тэмпе, з высокімі ўздымамі і стромкімі спускамі, з жывым, непадробным пачуццём апавядальніка, са смелымі абагульненнямі і вывадамі» [1, с. 33]. Жывая і выразная мова народнай казкі мае шмат трапных, дасціпных эпітэтаў, жывых і вобразных выразаў, параўнанняў, сэнсавай паэтыкі. К. І. Чукоўскі лічыў, што мэта казкі «складаецца ў тым, каб выхаваць у дзіцяці чалавечнасць — гэтую дзіўную здольнасць хвалявацца чужым няшчасцям, радавацца радасцям іншага, хвалявацца за чужы лёс, як за свой» [2, с. 27].

Як паказваюць назіранні, вучні любяць не толькі слухаць казкі, але і складаць уласныя па добра вядомых узорах. Намі была распрацавана сістэма падрыхтоўчых практыкаванняў да самастойнага напісання казкі з выкарыстаннем прыёмаў тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення: казкі навыварат, казкі ў зададзеным ключы, салата з казак. Так, прыём «Салата з казак» можа рэалізавацца на ўроках беларускай мовы праз наступныя варыянты практыкаванняў:

1. «Аб’яднанне»: нараджэнне новай казкі адбываецца за кошт аб’яднання назваў двух або некалькіх знаёмых казак, напрыклад: «Чорт-Злодзей» і «Каваль-Асілак», «Снягурачка» і «Вучоны рак», «Алёнка» і «Залаты птах», «Дзіва» і «Купалінка» і г. д.

2. «Апорныя словы»: з розных казак вылучаецца некалькі апорных слоў і падбіраюць адпаведныя малюнкі, напрыклад:

- сонца, змей, сын, сокал, дачка, крыніца;
- бацька, конь, царская дачка, пячатка, свінка, кабыліца, леў;
- змей, сястра, Гарошак, яда, булава, браты.

Затым з кожнага пераліку бяруць па 1–2 словы (малюнкі) і на іх аснове складаюць новую казку. Напрыклад, у якасці апорных слоў для новай казкі можа служыць наступны набор: сонца, змей, крыніца, царская дачка, леў, браты, булава.

3. «Дабаўленне»: да выдзеленых апорных слоў (малюнкаў) па ходзе развіцця казачнага сюжэта дадаюць малюнак з прадметам, які не адносіцца да казкі, напрыклад:

– сонца, змей, сын, сокал, дачка, крыніца – і папараць-кветка;
– бацька, конь, царская дачка, пячатка, свінка, кабыліца, леў – і залатая табакерка;
– змей, сястра, Гарошак, яда, булава, браты – і залаты птах.

4. «Марфалагічная скрыня»: у якасці апоры будуецца табліца, у якой акрамя назвы казкі пералічаны героі і месца дзеяння. Пры гэтым, калі ў некалькіх казках сустракаюцца аднолькавыя персанажы або месца дзеяння, то іх назвы заносяцца ў табліцу толькі адзін раз у любую з казак. Пры перасячэнні прамых табліца дае магчымасць выкарыстаць не менш за 20 варыянтаў апорных слоў для складання новай казкі, напрыклад:

| Назва казкі | Героі | | | | | Месца дзеяння |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Купалінка | Хлопец Іван | Дзяўчынка Ганна | Купалінка | Кветка папараці | Галінка вярбы | Лес |
| Вучоны рак | Дзед | Баба | Рак | Пан | | Поле, дом |
| Хведар Набілкін і яго таварышы | Хведар Набілкін | Асілак Дубавік | Цмок | Асілак Гаравік | Цар Храпун | Луг |

Усе прапанаваныя віды падрыхтоўчых практыкаванняў актывізуюць пазнавальную дзейнасць вучняў, развіваюць іх творчыя здольнасці. Значэнне казкі ў развіцці і выхаванні вучняў цяжка пераацаніць – гэта не толькі аснова народнай мудрасці, але і невычэрпная крыніца развіцця эмацыянальнай сферы і творчага патэнцыялу кожнага вучня. Метадычна правільна арганізаваная сістэма работы на ўроках беларускай мовы па аналізу народных і аўтарскіх казак рыхтуе вучняў да самастойнага напісання казак.

**Спіс крыніц**

1. *Маршак, С. Я.* Собрание сочинений: в 4 т. / С. Я. Маршак. – М. : Правда, 1990. – Т. 1 : Произведения для детей. – 266 с.
2. *Чуковский, К.* Сочинения в двух томах / К. Чуковский. – М. : Правда, 1990. – Т. 1 : Сочинения в двух томах. – 313 с.

***І. А. Сняжкова***
*Навуковы кіраўнік — В. І. Русілка*
Віцебскі дзяржаўны універсітэт,
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

## КОЛЕР ЯК АСНОВА ПАЭТЫЧНАГА ВОБРАЗА Ў ВЕРШАХ АЛЕСЯ ПІСЬМЯНКОВА

Колеравая сімволіка — надзвычай істотны ўтваральны элемент у творчасці любога аўтара. Яна найбольш поўна раскрывае духоўны і эмацыйны свет паэта, дапамагае тонка адчуць настрой верша, думкі і перажыванні творцы.

Колеравая гама Алеся Пісьмянкова самая разнастайная: ад ідэалізаванага і гарманічнага белага (“Ты адбі мне тэлеграму…”, “Зіма”, “Я прыеду, я вярнуся…” і інш.) да трывожна-змрочнага чорнага (“Калі ў вёсцы маёй паміраюць дзяды…”, “І страшна, і позна…”, “Балада пра камень”, “Сябру”). Неаднаразова антанімія “белы — чорны” сустракаецца ў межах аднаго верша (“Сустрэча з самім сабою”, “Белы конь”), што падкрэслівае кантраснасць жыццёвых з’яў, барацьбу супрацьлегласцей: жыцця і смерці, вечнага і імгненнага, душэўна чыстага, святога і грэшнага (“На свеце так багата святаў”, “Дума Вітаўта”).

У мастацкай палітры Алеся Пісьмянкова знаходзім іншыя колеры: ружовы выступае як сімвал бесклапотнасці, рамантычнасці, узнёсласці і наіўнасці думак (“Як гэта хораша — юнацтва”, “Не спяшайце мяняць акуляры ружовыя на звычайныя…”); зялёны — прыклад надзеі, еднасці з прыродай і радзімай (“Пасля вуліц ды завулкаў”, “Пераходзіць лета ў восень”, “Запрашэнне на Бесядзь”, “Адгарыць вось-вось зялёны…”); сіні — колер вады і неба — прыгожага і гарманічнага (“Вада, крынічная вада”, “Арытмія); чырвоны — сімвал трывогі і ўзрушанасці (“Балада пра ляся”, “Сон”).

Для паэзіі Алеся Пісьмянкова не было характэрным цёмнае, “чорнае” адлюстраванне рэчаіснасці, але яно часткова мела месца пасля Чарнобыльскай трагедыі. Вершы, прысвечаныя гэтай тэме, асабліва змрочныя; чорнае пераважна стаіць у апазіцыі з белым, сімвалізуючы бяду, разлом жыцця на “да і пасля” (“Белы конь”). Прысутнічае ў паэзіі вобраз чорнага першапачаткова гругана — міфалагізаванай птушкі гора, нябыту: “А чорны груган на пагосце / Думае: госці…” [2, с. 17].

Бясспрэчна дамінантным у вершах Алеся Пісьмянкова з’яўляецца белы колер. Тэндэнцыя да “светлага” адлюстравання рэчаіснасці назіраецца ўжо ў першым зборніку паэта “Белы камень” (1983), пра што сведчыць ужо сама назва кнігі.

Белы колер паэт часта выкарыстоўвае для апісання краявідаў сваёй малой радзімы, імкнучыся тым самым падкрэсліць чысціню, святасць сваіх патрыятычных пачуццяў, думак: “…Проста ў вёсцы Белы Камень / *самы белы* ў свеце снег”[2, с. 9]. Такі ж эпітэт заўважаем і пры апісанні ўсёй Беларусі: “Праз здрады і хіжасці град, / Праз войны і слёзы / Ты вынесла *белыя* косы / І чысты пагляд” [2, с. 8]. Тут белы колер выступае як сімвал непераможнай годнасці, выключнага хараства, маральнай чысціні народа.

У вершы “Чыстае” белае набывае іншае значэнне: яно выступае як сродак ачышчэння чалавечай душы. Белае для паэта — светлае маральна, эстэтычна, яно атаясамліваецца паэтам з нечым ідэальным. Зварот да чыстага — гэта пошук аўтарам шчасця і гармоніі.

У паэзіі Алеся Пісьмянкова неаднаразова бачым вобраз белых птушак. Бельскі А. І. перакананы, што “яны — не проста элементы лірычных замалёвак, а ўнутрана блізкія істоты, прылучаныя да лёсу паэта і зямлі Белай Русі,… сімвалы даверу паміж чалавекам і жывой прыродай, … увасабленне ўнікальнага, безабароннага ў навакольнай прыродзе” [1, с. 56]. Як прыклад — вершы “Я прыеду, я вярнуся…”, “Стараверы”, “Пераходзіць лета ў восень…”.

Белы колер часта выкарыстоўваецца аўтарам для апісання зімы: “Гляджу на матчыны сляды / На *белай* посцілцы двара…” [2, с. 57]. Снег у вершах паэта супрацьпастаўляецца змрочнаму, шэраму навакольнаму свету, сімвалізуе сабой не толькі прыгожае, паэтычнае, але і ідэальнае, тое, што мяняе адначасова наваколле і само жыццё.

Як сінонімы беламу ў творчасці Алеся Пісьмянкова выступаюць срэбраны, сонечны, залаты колеры, якія таксама атаясамліваюцца з нечым светлым: “У срэбры напалаканых лужын / Мерзнуць азяблыя зоркі…” [2, с. 21], “Залатая мяцеліца / Зноў сярэбрана зменіцца…” [2, с. 37]. Такая каларыстыка робіць аўтарскую паэзію зіхатлівай, светлай, наіўна-цнатлівай, асабліва рамантычнай. Найбольш яскрава такое душэўнае святло заўважаецца ў маладых, юнацкіх вершах (“Як гэта хораша — юнацтва…”, “І ўсё-такі цуда бывае!.. ”), дзе пераважае ўзвышэнне чысціні, а не, як пазней, настальгія па ёй.

Можна зрабіць вывад, што паэзія Алеся Пісьмянкова — своеасаблівая вясёлка, дзе пад разнастайнасцю колераў схавана багацце аўтарскіх пачуццяў, думак, перажыванняў. Такая “рознакаляровасць” робіць яго вершы яшчэ больш тонкімі і выразнымі.